**Ю.У.Акуліч,**
*аспірантка кафедры аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм*

# АБ ТЭНДЭНЦЫЯХ РАЗВІЦЦЯ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

Вышэйшая школа аказвае істотны ўплыў на тэмпы, якасць і спосабы рэалізацыі сацыяльнай і эканамічнай палітыкі краіны. Гэты ўплыў адлюстроўваецца ў кадравым забеспячэнні прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і культуры. Менавіта таму ўрады развітых краін звязваюць рост эканамічнага, навукова-тэхнічнага і культурнага патэнцыялу сваіх краін з эфектыўнасцю адукацыйных сістэм.

У праекце Канцэпцыі развіцця вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь адзначана, што асноўнай мэтай вышэйшай адукацыі ў краіне з'яўляецца фарміраванне інтэлектуальнага патэнцыялу грамадства як важнейшага фактару яго сацыяльнага і эканамічнага развіцця.

Разумеючы важнасць адукацыі, грамадства з першых гадоў свайго існавання ўдзяляла асаблівую ўвагу стварэнню вышэйшых навучальных ўстаноў. Элементы вышэйшай адукацыі, як адзначаюць гісторыкі, з'явіліся яшчэ ў Вавілоне, Старажытным Егіпце, Індыі, Кітаі.

Але вышэйшая адукацыя ў сучасным разуменні ўзнікла ў сценах сярэднезяковых універсітэтаў, якія з'явіліся ў Балонні (прававая школа, 1158 г.) і Салерна (вышэйшая медыцынская школа, 1164 г.). У канцы XII—XIII ст. узніклі універсітэты ў Парыжы (1215), Манпелле (1289), Кембрыджы (1209), Оксфардзе (1168). А напрыканцы XV ст. у Еўропе існавала ўжо 79 вышэйшых навучальных устаноў.

Менавіта са з'яўленнем універсітэтаў і закладваюцца асноўныя тэарэтычныя асновы вышэйшай адукацыі, якія і вызначаюць яе далейшае развіццё.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У дадзенай публікацыі разглядаецца гісторыя фарміравання базавых крытэрыяў вышэйшай адукацыі.

У XIX ст. вышэйшая адукацыя набывае вялікую сацыяльную значнасць і прыцягвае ўвагу даследчыкаў. З гэтага часу атрымала развіццё гісторыя вышэйшай адукацыі. Ёй прысвяцілі свае працы Хр.Майнер (чатырохтомная параўнальная гісторыя універсітэтаў выйшла ў 1802—1805 гг.), Г.Каўфман (у 1888 г. ён выдаў гісторыю германскіх універсітэтаў). У 1885 г. быў надрукаваны трохтомнік Г.Рэшдола "Універсітэты Еўропы ў сярэднія стагоддзі". Культурнай падзеяй стала кніга амерыканскага гісторыка Ч.Гаскінса "Узвышэнне універсітэтаў" (1923), у аснову якой быў пакладзены курс яго лекцый.

У даследаваннях XIX — пачатку XX ст. увага надавалася станаўленню вышэйшай адукацыі як сацыяльнай з'явы і вызначаліся яе асноўныя паняцці.

Адным з тэарэтыкаў вышэйшай адукацыі XIX ст. з'яўляецца Джон Генры Ньюмэн — рэктар Ірландскага каталічнага універсітэта. Яго погляды выклікаюць цікавасць даследчыкаў — філосафаў і гісторыкаў. Аб гэтым сведчыць значны аб'ём публікацый, прысвечаных вывучэнню яго жыцця і творчай спадчыны.

На погляд Джона Генры Ньюмэна, універсітэт — гэта месца, дзе навучаюць універсальным ведам. "Калі б мяне папрасілі растлумачыць коратка і папулярна, што такое універсітэт, — пісаў Ньюмэн, — я б вывеў свой адказ з яго старажытнай назвы — "studium generale", або "школа універсальнага навучання". Сказанае азначае, што мэта навучання ва універсітэце, з аднаго боку, інтэлектуальная, з другога, звязана з распаўсюджваннем і набыццём ведаў. На яго погляд, прызначэнне універсітэта — фарміраванне інтэлектуальнай культуры. Менавіта на ёй "павінна быць засяроджана ўвага вучоных, менавіта гэта вызначае змест іх працы, арыентаванай на ўсебаковае развіццё інтэлекту, на пазнанне і вызначэнне ісціны..."

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Універсітэт, паводле Ньюмэна, павінен стаць месцам актыўных якасных зносін людзей. Ён павінен быць падобны на свецкае грамадства, якое з'яўляецца правобразам універсітэта, выхоўваючы джэнтльменаў пры дапамозе дэманстрацый і паўтору добрых манер, звычак і нормаў паводзін. Задача такой "школы" заключаецца ў аб'яднанні "ў вызначаным месцы" мноства людзей з усіх частак краіны з мэтай забеспячэння "свабоднай цыркуляцыі" думкі "пры дапамозе асабістых зносін".

Такім чынам, Ньюмэн лічыў, што вышэйшая адукацыя прадвызначае інтэлектуальнае развіццё студэнтаў, вучыць іх магчымасцям і метадам рабіць правільныя меркаванні аб сутнасці з'яў і імкнуцца да пошуку ісцін. На яго думку, нават дыяпазон вывучаемых дысцыплін не можа быць абмежаваны якім-небудзь пэўным асяроддзем, а павінен уключаць як мага больш розных прадметаў. Вядома, студэнты не могуць займацца ўсімі без выключэння дысцыплінамі, але ён і не бачыць у гэтым неабходнасці, таму што галоўная мэта універсітэта — не паведаміць якую-небудзь канкрэтную інфармацыю, а даць студэнту магчымасць "з галавой акунуцца" ў свет навукі, навучыцца спрачацца і паважаць апанентаў, раіцца з імі і дапамагаць адзін аднаму. Усё гэта спрыяе стварэнню "інтэлектуальнага свету, чыстай і яснай атмасферы думкі, якой дыхае студэнт, хаця ў сваім выпадку ён вывучае толькі некалькі навук з мноства".

Прафесар філасофіі Мадрыдскага універсітэта Х.Артэга-і-Гасет у сваёй кнізе "Місія універсітэта" вылучае наступныя патрабаванні да вышэйшай адукацыі.

Універсітэт дае вышэйшую адукацыю, якую можа атрымаць звычайны чалавек. Вышэйшая адукацыя павінна зрабіць чалавека культурным, г. зн. паставіць яго на вышыню патрабаванняў часу. Адсюль вынікае галоўная функцыя універсітэта — авалоданне студэнтамі ведамі па фундаментальных дысцыплінах: фізіцы, біялогіі, гісторыі, сацыялогіі, філасофіі. Вышэйшая адукацыя робіць звычайнага чалавека спецыялістам. Каб зрабіць чалавека

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесіяналам, вышэйшая навучальная ўстанова павінна патрабаваць ад студэнта тое, што яму спатрэбіцца ў жыцці, а таксама выкарыстоўваць самыя рацыянальныя і эфектыўныя метады работы. Ён лічыў, што як агульнаадукацыйныя дысцыпліны, так і прафесійныя трэба выкладаць рацыянальна і сістэматычна, зыходзячы з заканамернасцей навукі, і быў упэўнены, што навучальная ўстанова павінна прад'яўляць жорсткія патрабаванні да студэнтаў, каб яны былі добрымі спецыялістамі.

Х.Артэга-і-Гасет лічыў, што навуковыя даследаванні павінны быць выключаны са зместу універсітэцкай адукацыі. Ён адзначаў, што студэнтам нельга даваць матэрыял у тым выглядзе, у якім ён прадстаўлены ў навуковых даследаваннях: спецыяльныя праблемы, прынятыя мадэлі, эксперыменты. Пры падборы прафесараў вучоны раіў кіравацца іх схільнасцямі да педагагічнай працы, а не зыходзіць з таго, якімі даследаваннямі яны займаюцца.

Карл Ясперс прытрымліваўся іншага пункту погляду. У сваёй кнізе "Ідэя універсітэта" ён падкрэслівае даследчую функцыю нямецкай універсітэцкай традыцыі. Універсітэт, на думку К.Ясперса, — гэта таварыства вучоных і студэнтаў, занятых сумесным пошукам ісціны. Ён самастойна вырашае пытанні, якія датычацца універсітэцкага жыцця, незалежна ад таго, на якія сродкі ён жыве. Як і царква, універсітэт настолькі аўтаномны, што гэта павінна прызнавацца нават дзяржавай. Такая аўтаномія вынікае з непахіснасці наднацыянальнай, сусветнай ідэі акадэмічнай свабоды. Свабода — гэта як раз тое, што неабходна універсітэту.

Універсітэт — гэта школа, але школа асаблівага роду. Яе прызначэнне не толькі ў тым, каб быць месцам падрыхтоўкі; у значна большай ступені ў яе сценах студэнт актыўна ўдзельнічае ў даследаваннях, і па меры назапашвання вопыту такой работы ў яго фарміруюцца якасці, звязаныя з інтэлектуальнай дысцыплінай, ён

атрымлівае адукацыю, якая застаецца з ім на ўсё жыццё. У ідэале студэнт думае незалежна, успрымае крытычна і нясе адказнасць толькі перад сабой. Ён вольны ў сваім імкненні вучыцца.

Карл Ясперс вылучаў чатыры функцыі вышэйшай адукацыі.

1. Даследаванне, выкладанне, навучанне спецыяльным прафесіям, таму што толькі ў працэсе навуковай дзейнасці сапраўдны вучоны можа стаць добрым выкладчыкам. На думку К.Ясперса, студэнты абавязаны сумесна з выкладчыкам удзельнічаць у даследчай рабоце, якая не толькі вучыць метадам і самастойнасці, але і з'яўляецца фундаментам яго прафесійнага станаўлення.

2. Адукацыя і выхаванне. "Выхаванне, — піша ён, — ёсць спосаб, якім асобныя грамадскія формы ўзнаўляюць сябе пры дапамозе перадачы праз пакаленні". Вышэйшая адукацыя можа даць выхаванне толькі ў выглядзе прадстаўлення студэнтам поўнай свабоды самаадукацыі. Выбар курса, наведванне заняткаў павінны быць вольнымі.

3. Духоўная камунікацыя. Зносіны — галоўная ўмова і галоўная каштоўнасць. Камунікатыўная функцыя павінна забяспечыць свабоду зносін тым, хто знаходзіцца ў сценах універсітэта. Атмасфера духоўных зносін не прызнае ніякіх абмежаванняў ні па статусе, ні па ўзросце, ні па спецыялізацыі: дыспуты, спрэчкі, канферэнцыі, дыялогі, — усё, што пажадана, акрамя палітыкі. Духоўная атмасфера універсітэта павінна быць палітычна нейтральнай.

4. Прадстаўленне студэнтам «сусвету навук». З'яўляючыся "сусветам навук", вышэйшая адукацыя падпарадкоўвае ўсе навукі агульнай задачы пошуку ісціны праз сваіх прадстаўнікоў — выкладчыкаў.

Спрачаючыся з Х.Артэга-і-Гасетам, К.Ясперс лічыў, што ва універсітэце няма месца экзаменам. Пры экзаменацыйнай сістэме падменьваюцца мэты, месца ідэальнай адукацыі займае імкненне набыць хутка забываемыя веды. Экзамены ўведзены для засведчання



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукаванасці, якую ніхто, акрамя жыцця, засведчыць не можа.

Адна з найважнейшых сацыяльна-культурных функцый адукацыі, як лічыць К.Ясперс, — сацыяльны адбор найболып таленавітых і адароных асоб. "Менавіта ВНУ абавязана займацца інтэлектуальным выратаваннем таленавітых індывідаў".

Такім чынам, вышэйшая адукацыя, паводле К.Ясперса, павінна вырашаць тры задачы: прафесійную падрыхтоўку, адукацыю чалавека і даследчую работу, а універсітэт выступае ў выглядзе прафесійнага, культурнага і даследчага інстытута. К.Ясперс сцвярджае, што ў самой ідэі універсітэта закладзены тры непарыўныя аспекты яго дзейнасці. Ніводнага з іх нельга выключыць, не парушыўшы інтэлектуальную атмасферу, уласцівую універсітэту, і адначасова не нанёсшы ўрон выбранай функцыі. Усе тры аспекты — складаючыя, элементы цэлага. Калі іх ізаляваць адзін ад аднаго, то будзе страчаны дух універсітэцкай адукацыі.

У сваю чаргу Роберт Пауль Вольф, прафесар філасофіі універсітэта ў Масачусеце, прапанаваў рэформу універсітэцкай адукацыі, якая грунтуецца на наступных мадэлях: універсітэт як храм вучонасці, як месца даследчай работы студэнтаў; універсітэт як цэнтр "штампоўкі служачых", неабходных грамадству; універсітэт як цэнтр сацыяльных паслуг, якія ён аказвае дадзенаму рэгіёну. "Самым распаўсюджаным з'яўляецца параўнанне універсітэта з вежай са слановай косткі, з гэтым сімвалам свяцілішча, унутры якога вучоны чалавек рэалізуе сваё кніжнае прызванне".

Найбольш цікавай з'яўляецца мадэль універсітэта як цэнтра прафесійнай падрыхтоўкі, прапанаваная ў свой час прэзідэнтам Каліфарнійскага універсітэта. Тут універсітэт прадстаўлены ў выглядзе складанага інстытута, "мультыуніверсітэта", утвараючага сістэму адукацыйных, даследчых, кансультацыйных і іншых службаў, якія аказваюць паслугі амерыканскаму грамадству.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В.Тэйлар лічыць, што ад універсітэтаў чакаюць аказання розных паслуг непасрэдна свайму рэгіёну. Ён піша: “У тых краінах, дзе універсітэты ўтвараюць фармальную ці нефармальную іерархічную сістэму, прэстыжныя універсітэты могуць здзяйсняць прыём студэнтаў у нацыянальным маштабе, праводзіць прыём галоўным чынам у межах сваіх рэгіёнаў. Але незалежна ад таго, з’яўляюцца універсітэты інтэрнацыянальнымі, нацыянальнымі або рэгіянальнымі ўстановамі, у шматлікіх краінах яны даюць магчымасць дарослым вучыцца па месцы жыхарства (павышэнне кваліфікацыі, бесперапынная адукацыя), прапануюць сучасныя курсы і праграмы для лакальных прафесійных груп, кансультацыйныя паслугі — мясцовай прамысловасці і мясцоваму таварыству (удзельнічаюць у жыцці рэгіёна, падтрымліваюць кантакты са школамі і іншымі адукацыйнымі установамі і іх асяроддзем). Універсітэты іграюць значную ролю і ў вырашэнні праблемы занятасці. Нярэдка універсітэт — гэта самы буйны работадаўца ў рэгіёне...”

Такім чынам, універсітэт успрымаецца не толькі як вучэбны, навуковы ці культурны цэнтр, але і як сацыяльны цэнтр, які можа аказаць рад камерцыйных і дабрачынных паслуг.

Люсьен Мішод, генеральны сакратар Міжнароднай федэрацыі каталіцкіх універсітэтаў, лічыць найбольш значнымі наступныя функцыі вышэйшай адукацыі.

1. Навучальная, якая прадугледжвае захаванне і перадачу ведаў, навукі, культуры, вучонасці.

2. Даследчая, што накіравана на развіццё ведаў, вольны пошук ісціны.

3. Прафесійная функцыя азначае падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў.

4. Сервісная функцыя — гэта забеспячэнне паслуг, экспертных ацэнак, звязаных з эканамічным, палітычным, сацыяльным і культурным развіццём грамадства.

5. Культурная функцыя звязана з фарміраваннем інтэлектуальных і іншых здольнасцей, развіццём патэнцыялу кожнага вучня.

6. Гуманістычная функцыя азначае валоданне фундаментальнымі канцэпцыямі, ідэямі (агульная адукацыя) і ўсведамленне, разуменне фундаментальных каштоўнасцей чалавецтва, цывілізацый і культур свету.

У манаграфіі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы і гуманітарнай адукацыі "Канцэпцыя гуманітарызацыі вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь" вылучаюцца наступныя функцыі.

1. Навучальная, якая заключаецца ў перадачы інфармацыі з дапамогай вобразных сродкаў.

2. Даследчая як самая галоўная ва універсітэце. Даследаванне, навучанне і адукацыя — непадзельныя.

3. Прафесійная, якая азначае, што ВНУ — вучэбны цэнтр прафесійнай падрыхтоўкі.

4. Сервісная функцыя, дзякуючы якой аказваюцца разнастайныя паслугі свайму рэгіёну і мясцоваму таварыству, тым самым узмацняецца канкурэнтаздольнасць яго эканомікі.

5. Культурная функцыі прадугледжвае развіццё культуры інтэлекту, інтэлектуальную адукацыю.

6. Гуманістычная функцыя звязана з трансляцыяй агульнай культуры, з важнейшай сістэмай ідэй, што датычацца свету, чалавека, нашага часу.

Такім чынам, абапіраючыся на вышэйпададзенае, мы лічым, што ў працэсе бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі павінны выконвацца наступныя функцыі, якія спалучаюцца з дзейнасцю бібліятэк як сацыяльнага інстытута.

1. Прафесійная, яна заключаецца ў фарміраванні высокакваліфікаваных спецыялістаў. Студэнт не толькі стварае сябе як прафесіянал, але і вучыцца дапамагаць чытачам гэта рабіць.

2. Інтэлектуальная, якая заключаецца ў набыцці, распаўсюджванні і захаванні ведаў, а таксама ў развіцці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разумовых здольнасцей кожнай асобы. Гэтая функцыя поўнасцю адпавядае задачам дзейнасці бібліятэкі.

3. Даследчая функцыя павінна садзейнічаць выхаванню студэнта як вучонага-даследчыка. Гэта функцыя найбольш важная для работнікаў акадэмічных бібліятэк, якія аказваюць дапамогу ў навукова-даследчай дзейнасці.

4. Гуманістычная функцыя прадугледжвае засваенне культурных каштоўнасцей. Бібліятэкар не можа стаць добрым спецыялістам, не авалодаўшы асноўнымі ведамі, назапашанымі грамадствам.

Менавіта выконваючы ў вучэбным працэсе пералічаныя функцыі, магчыма зрабіць бібліятэчна-інфармацыйную адукацыю больш цікавай і эфектыўнай.

**А.М.Багарэвіч,**
*аспірантка кафедры*
*бібліятэказнаўства*

## АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ ПРАЦЭСАЎ КАМПЛЕКТАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ: ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Са з'яўленнем у канцы 1980-х гг. новага класа вылічальнай тэхнікі — персанальных камп'ютэраў — пачалася аўтаматызацыя бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Так, у 1989 г. намаганнямі спецыялістаў НББ і НВФ "ІНЕАК" была складзена Аўтаматызаваная бібліятэчна-інфармацыйная сістэма (АБІС) Міністэрства культуры БССР.

Укараненне аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў у НББ было распачата ў аддзеле камплектавання. Камплектаванне ўключае наступныя традыцыйныя тэхналагічныя складальнікі бібліятэчнай працы: заказ літаратуры, вядзенне картатэк на заказаную літаратуру, падрыхтоўка звестак аб выданнях, якія не паступілі, паступленне літаратуры па шматлікіх крыніцах, прыём,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ